

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

АРГАН РЭКТАРАТА, ПАРТКОМА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА
ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

№ 3 (158) 22 СТУДЗЕНЯ 1991 ГОДА

## АДБЫЎСЯ

агульнауніверсітэцкі партыйны сход. Асноўныя пытанні, якія былі разгледжаны:

— аб праграме дзейнасці партыйнай арганізацыі універсітэта ў святле рашэнняў XXVIII з 'езда КПСС і XXXI з 'езда КПБ;

— аб асноўных напрамках расходу фінансавых сродкаў партарганізацыі ў 1991 годзе.

Матэрыялы з партыйнага сходу будуць змешчаны ў наступным нумары газеты.

## Пытанне — адказ

**Каго лічыць паспяваючым студэнтам? Іншы раз думкі наконт гэтага разыходзяцца. Асабліва, калі размова аб тых, хто здаў экзамен не з першага разу. Чытачы папрасілі рэдакцыю пазнаёміць студэнтаў і выкладчыкаў з інструктыўным пісьмом Дзяржадукацыі СССР, дзе гаворка датычыцца пытання «Каго лічыць паспяваючым студэнтам».**

«...К числу успевающих относятся студенты высших и учащиеся средних специальных заведений, не имеющие академической задолженности по результатам экзаменов и итогового контроля за семестр. Студентам и учащимся, получившим неудовлетворительные оценки, выплата стипендии прекращается до ликвидации ими академической задолженности в установленном порядке. Пересдавшим неудовлетворительные оценки выплата стипендии возобновляется со дня пересдачи и выплачивается в соответствии с полученными положительными оценками с учетом 50 процентов и 25 процентов надбавок соответственно за отличную и хорошую успеваемость.

Расходы на оказание материальной помощи студентам и учащимся, оплату льготного питания и другие цели производятся из фонда социальной помощи остронуждающимся студентам и учащимся, образуемого за счет экономии стипендиального фонда учебного заведения и средств, полученных из других (внебюджетных) источников. Дополнительное выделение средств из бюджета на указанные цели не предусматривается.

Студентам и учащимся, получившим по результатам семестра только хорошие оценки, стипендия выплачивается в обычном размере, без 25-процентной надбавки.

Выплата надбавок к стипендии студентам вузов в размере 10 или 15 рублей в месяц и учащимся средних специальных учебных заведений в размере 7 или 15 рублей, установленных приказами Гособразования СССР..., производится соответственно к 40 или 30 рублям в месяц до введения новых размеров стипендий, предусмотренных постановлением Совета Министров СССР, ВЦСПС и ЦК ВЛКСМ.

Размер стипендии, выплачиваемой студентам высших и учащимся средних специальных учебных заведений государственными предприятиями, организациями и учреждениями, заключившими с ними индивидуальные договоры, согласно постановлению Совета Министров СССР, может превышать 100 рублей в месяц».

# У студэнтаў — сесія

## *...На падказках далёка не заедзеш!*

**Не думай аб секундах звысоку. Наступіць сесія, сам зразумееш, што перад залікам або экзаменам кожнае імгненне неабходна выкарыстоўваць для падрыхтоўкі.**

**І нават калі іспыт пачаўся, тут, у калідоры, на апошняй мяжы перад дылемай «залік або незалік, пан або прапаў» падрыхтоўчы перыяд дасягае свайго апагею. Дзе толькі не заўважыш у гэты час студэнта: і на падаконніку, і на лесвіцы, і проста прытуліўшыся да сцяны, зрэдку — седзячы ў крэсле ці за аудыторным сталом.**



**І вось сесія ідзе поўным ходам. Сёння пойдзе размова пра гісторыкаў. Наша сустрэча адбылася ў час датэрміновай здачы экзаменаў і залікаў.**

Спачатку я звярнулася да дэкана факультэта Чарапіцы Валерыя Мікалаевіча з тым, каб даведацца, ці змянілася што-небудзь у правядзенні сесіі ў параўнанні з мінулымі гадамі.

— Я вельмі задаволены, што з мінулага года пачалося павышэнне паспяховасці. Раней, у мінулыя гады, назіраўся рэзкі спад паспяховасці, таму што колькасць лекцый скарачалася і большы націск рабіўся на самастойную работу студэнтаў, павялічвалася патрабавальнасць да іх. А гэта адбілася і на сесіі. Не хапала падручнікаў, дапаможнікаў, неабходнай літаратуры. Зараз мы не робім націск на так званы працэнт паспяховасці. Станоўчую ролю адыграла вольнае наведванне заняткаў. Студэнты адчулі, што прапушчаныя заняткі — гэта недастаткова засвоены матэрыял. Але імкнуліся паказаць на экзамене, на што яны здольныя. І летняя сесія гэта пацвердзіла.

Добра прыжылася на факультэце датэрміновая паэтапная здача экзаменаў і залікаў. Студэнтам гэта зручна. Загадзя вызначаецца колькасць экзаменаў, але не больш трох. З 'явіліся новыя формы залікаў. Зараз мы стараемся павысіць якасць ведаў студэнтаў. На працягу ўсяго семестра ідзе барацьба за веды. Залікам можа стаць пісьмовая работа, курсавая работа (летам) — экзаменам. Адна з нашых задач зараз — гэта надаць большую значнасць кансультацыям перад экзаменам. Трэба, каб гэта былі не толькі адказы на незразумелыя пытанні, але і чытанне праблемных лекцый. З боку дэканата гэта знаходзіць падтрымку.

Сярод новаўвядзенняў на факультэце і магчымасць старастам груп прысутнічаць на экзамене. Яны маюць права паўплываць на аб 'ектыўнасць выстаўляемай адзнакі. Але студэнты пазбягаюць гэтага. Узнікае як быццам бы нейкі недавер да выкладчыка. Але ўсё ж права такое яны маюць. Не сакрэт, што ў наш час яшчэ ёсць такія выкладчыкі, для якіх экзамен ці залік — гэта «свята», калі можна прыпомніць грахі. Каб пазбегнуць канфліктаў, студэнты звяртаюцца ў дэканат, і мы робім усё для таго, каб наладзіць адносіны паміж студэнтамі і выкладчыкамі.

**— Валерый Мікалаевіч, а як абстаяць справы на факультэце ў сувязі з пераходам выкладання на беларускую мову?**

— Трэба сказаць, што не для ўсіх студэнтаў гэта зручна. Мы, вядома, падтрымліваем імкненне да беларускай мовы. Калі студэнт хоча на занятках, заліках або экзаменах размаўляць па-беларуску, яму ніхто не забараняе гэтага, а хто не можа пакуль што адказваць на беларускай мове, той карыстаецца рускай. Не ўсе прадметы зараз выкладаюцца на беларускай мове. Ёсць такія, дзе шмат даводзіцца цытаваць працы летапісцаў, ды і падручнікі пакуль што яшчэ на рускай мове. А вось на кафедры гісторыі БССР выкладанне вядзецца на беларускай мове. Па гісторыі СССР семінарскія заняткі таксама на беларускай мове. Ды ў час сесіі галоўнае ўсё ж не мова, а якасць ведаў.

І тут студэнты падтрымліваюць свайго дэкана. У размове з імі гучала агульная думка, што датэрміновая паэтапная здача сесіі дапамагае, дае магчымасць больш часу аддаць на падрыхтоўку да больш складаных экзаменаў.

На чацвёртым курсе ў гэту сесію чатыры экзамены і тры залікі. І хоць галоўнае яшчэ наперадзе, але старт ужо дадзены, ёсць першыя вынікі.

З аудыторыі, дзе праводзіўся экзамен па крыніцазнаўству гісторыі СССР, выйшаў Генадзь Юрэвіч. На твары — задавальненне і ўсмешка. Я вырашыла пацікавіцца ў яго вынікамі экзамену.

**— Генадзь, як ты адносішся да выказвання: экзамен — гэта латарэя?**

— Я так не лічу. Ніякай латарэі ў студэнтаў-гісторыкаў быць не можа. Уявіце, што вы атрымалі той «шчаслівы» білет, але без цвёрдага ведання матэрыялу не зможаце адказаць на дадатковыя пытанні экзаменатара. Некалькі пытанняў — і вынік не на карысць студэнту.

Думаю, поспех залежыць і ад студэнта, і ад выкладчыка. Наогул, я лічу, што на падказках далёка не заедзеш і сапраўднага гісторыка з цябе не атрымаецца. Таму хачу пажадаць усім студэнтам цвёрдых ведаў, поспехаў і добрых адзнак.

Хачу далучыцца да пажаданняў Генадзя і некалькі слоў сказаць пра яго самога. Генадзь мае сям 'ю. Дома яго чакае жонка і маленькая дачушка. Думаю, што ён парадуе іх чацвёркай, атрыманай сёння на экзамене. Поспехаў табе, Генадзь, і ў будучым.

Вось так пачалася сесія на гістарычным факультэце.

**Г. КАМЕНЕВА.**





І вось адказны момант наступіў. У студэнтаў 3-га курса 3-яй групы цяжкі дзень. Здаюць яны паэтапны экзамен (2-гі этап) 1 залік (па раскладу) па гісторыі СССР. Аб 'ектыўнасць адзнакі сёння залежыць ад Кобрынца Паўла Мікалаевіча. Студэнты 4-га курса 1-й групы паказваюць свае веды па крыніцазнаўству гісторыі СССР. Паўлючэнка Ніна Уладзіміраўна ўважліва слухае адказы будучых гісторыкаў, каб даць ім правільную ацэнку.

*НА ПАРАДКУ ДНЯ ВУЧОНАГА САВЕТА*

Пытанне **«Аб ходзе выканання калектывам універсітэта доўгатэрміновай праграмы «Родная мова і культура»** разгледжана на нядаўнім пасяджэнні Вучонага савета.

Улічваючы важнасць праблемы, цікавасць да яе студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта, змяшчаем наступныя матэрыялы.

## АБ ХОДЗЕ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАГРАМЫ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА І КУЛЬТУРА» Ў ГРОДЗЕНСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ ІМЯ Я. КУПАЛЫ

### ВЫСТУПЛЕННЕ НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

Сёння, калі ў нашай краіне нарастаюць працэсы перабудовы, ажыццяўляецца рэформа палітычнай сістэмы, перад грамадскасцю і насельніцтвам рэспублікі паўстаюць праблемы, якія патрабуюць свайго вырашэння самым сур´ёзным чынам без адкладвання на больш спрыяльныя ўмовы ці час. Праблемы надзвычай складаныя. Сярод іх на першы план выступаюць пытанні дзяржаўнага суверэнітэту, захавання і развіцця нацыянальнай беларускай культуры, роднай мовы, культуры, моў іншых нацыянальных супольнасцей, якія жывуць у рэспубліцы, звычаяў, укладу жыцця, адраджэння гістарычнай і культурнай спадчыны.

Праблемы, звязаныя з адраджэннем і далейшым развіццём беларускай нацыянальнай культуры, мовы сёння набылі асаблівую вастрыню і актуальнасць. Усё больш і больш людзей у рэспубліцы ўсведамляе, што **мова** не толькі сродак зносін. Яна аснова культуры народа, яе найважнейшая частка. Гістарычна і этнічна тэрыторыя Беларусі з´яўляецца месцам пражывання беларускай нацыі. Тут узніклі і склаліся яе культура, мова, традыцыі, звычаі. Напрошваецца высновa, што ў такім разе яна павінна была б стаць гаспадыняй ў сваёй хаце. Але...гісторыя краю, у тым ліку і Гродзеншчыны, увабрала ў сябе эпоху, калі беларуская мова функцыяніравала як дзяржаўная мова ў Вялікім княстве Літоўскім, стагоддзі духоўнага здзеку і ўціску спачатку з боку Рэчы Паспалітай, а пазней — царскага самадзяржаўя шляхам насільнага ажыццяўлення на практыцы пастулатаў шавіністычнай палітыкі, калі цэламу народу адмаўлялі ў праве размаўляць, ствараць культурныя помнікі на роднай мове, робячы ўсё мажлівае на яго духоўнае вынішчэнне з накірункам да асіміляцыі. Гэта ў дакастрычніцкі час. Не скарыліся, не ўпалі на калені, выжылі...

Пасля 1917 лёс наканаваў нашай мове стацца дзяржаўнай і першае дзесяцігоддзе ў новых умовах з´явілася актыўным ўзлётам беларускай мовы ва ўсіх сферах жыцця рэспублікі, якая амаль вырашыла моўную праблему.

Аднак, пачынаючы з канца 20-х гадоў пачалося ў прамым сэнсе слова «фізічнае выкошванне» беларускай інтэлігенцыі і інтэлігенцыі другіх народаў нашай краіны, прынамсі, да сярэдзіны 50-х гадоў, родная мова выкарчоўвалася з выключнай прадузятасцю. А ўжо пасля, без перадыху, у часы застою завяршылі інквізітарскі суд над ёй розныя тэорыі аб зліцці нацый і адміранні моў, уніфікацыі народных культур, якія прывялі нас на мяжу духоўнай катастрофы. Не сакрэт, а горкая ява, што ўсё гэта сталася прычынамі, якія абумовілі рэзкае звужэнне сфер функцыяніравання беларускай мовы, што ў сваю чаргу прывяло да страты ў значнай часткі насельніцтва пачуцця каштоўнасці нацыянальнай культурнай спадчыны, да дэфармацыі нацыянальнай свядомасці.

І ўжо сёння, як ніколі, варта вельмі сур´ёзна «праштудзіраваць» урокі мінулага, уважліва прааналізаваць усе «за» і «супраць» у адносінах да **моўнай праблемы**. На яе, не памылімся, паклала свой адбітак гісторыя, складаная, з мноствам «белых плям», якія, на жаль, падаюцца са шматлікімі хібамі, недагаворваннямі, прыфарбоўваннем, фальсіфікаваннем тых ці іншых падзей нашага далёкага і сучаснага.

У гэтай сітуацыі станоўчая, а мажліва і рашаючая роля выпадае Гродзенскаму дзяржаўнаму універсітэту, які ў даным рэгіёне мае лёсаноснае значэнне ў плане падрыхтоўкі і навучання на роднай мове будучых спецыялістаў для ўсіх сфер жыццядзейнасці нашага грамадства, асабліва для сферы культурных, духоўных запатрабаванняў насельніцтва.

Апроч усяго, гэтага запатрабуе і скіроўвае на вялікую творчую працу ўвесь калектыў універсітэта імя Я. Купалы Праграма«Беларуская мова і культура», зацверджаная нашым Вучоным саветам 27 кастрычніка 1989 г. і прынятая Саветам універсітэта 27 лютага 1990 г.

Ёсць свае плюсы і свае мінусы амаль па кожнаму пункту Праграмы. Да прыкладу, толькі напалову выконваецца ўжо самы першы пункт (увесці на кожным факультэце беларусазнаўчыя дысцыпліны: гісторыя Беларусі, беларуская мова, гісторыя беларускай літаратуры або гісторыя беларускай культуры). Аб´ём гадзін на беларускай мове — да 200 гадзін. А на справе — чытаюцца толькі гісторыя Беларусі і гісторыя беларускай культуры, а для роднай мовы, матчынай мовы не адшукалі месца ў раскладзе, а прасцей кажучы, зачынілі перад ёю дзверы. Гэтае пытанне вельмі сур´ёзнае, паколькі сённяшні студэнт заўтра стане настаўнікам і большасць з іх будзе працаваць на вёсцы ў школе з беларускай мовай выкладання. І ніякавата будзе адчуваць сябе малады спецыяліст, сорамна будзе глянуць у вочы з-за няведання, няўмення правесці ўрок ці пэўнае мерапрыемства на мове бацькоў. Але гэта будзе не толькі яго сорам і віна, але і нашы з Вамі. Гэта па сутнасці мы пусцілі яго ў шырокі свет з напаўпустым багажом, з пагардлівым стаўленнем да роднай мовы, да духоўнасці. Родная мова і духоўнасць...

Толькі ці не гучныя гэтыя словы для большасці з нас? Ці здольны яны прабудзіць у нашых душах тую,так патрэбную і неабходную, высокую культуру пачуццяў з мэтай абуджэння нашай нацыянальнай свядомасці, усведамлення сябе, як народа, як роўнага сярод роўных. І ўсё ж, ці не ранавата загаварылі мы аб высокай духоўнасці беларусаў, якія толькі пачынаюць прачынацца ад літургічнага сну, ад духоўнай «спячкі» калі, апроч таго, гэтая духоўнасць пазбаўлена патрыятычнага пачуцця, пачуцця сумлення, гонару, прыстойнасці і павагі да бацькоў, да каранёў вялікага гістарычнага дрэва роду свайго.

Культура, духоўнасць, мова, чалавек і г. д. — гэта звенні аднаго ланцужка. Страта нават аднаго з іх зводзіць на нішто нашыя самыя сур´ёзныя намеры і памкненні, асабліва страта галоўнага звяна — **мовы.**

Варта толькі вітаць перавод на беларускую мову шматтыражнай газеты «Гродзенскі універсітэт». Але ў такім разе патрэбна было б праяўляць вытрыманасць у самых непрадбачных абставінах, павагу да саміх сябе. Праходзяць навуковыя канферэнцыі на рэспубліканскім, на ўсесаюзным узроўні, а матэрыялы з´яўляюцца на рускай мове. Пэўна, не пакрыўдзіліся б нашы госці, калі б свае ўражанні, думкі прачыталі на беларускай мове ў шматтыражцы. Здавалася б дробязь, але за ёю бачыцца вялікае: патрабуецца карэкцыя штату рэдкалегіі газеты, а так бачыцца надзвычай бедны слоўнік, шмат моўных памылак. Значыцца, патрэбна большая аддача, сур´ёзная праца супрацоўнікаў шматтыражкі. Як-ніяк, а гэта ў якойсьці ступені твар універсітэта. Нас чытаюць і даюць адпаведныя тлумачэнні, адзнакі.

У адпаведнасці з Праграмай створана ва універсітэце і кафедра беларускай культуры, менавіта кафедра агульнауніверсітэцкая. На яе ўскладаліся вялікія надзеі. Аднак яна ўкамплектавана толькі напалову, ды і то за лік выкладчыкаў кафедр беларускай мовы і літаратуры. Агульнауніверсітэцкая кафедра, але з-за фармальнага складу не можа забяспечыць чытанне беларускай літаратуры на падрыхтоўчым аддзяленні ўсіх факультэтаў універсітэта, на вячэрніх курсах і т. д.

Усе гэтыя гадзіны аўтаматычна перакладваюцца на плечы кафедры беларускай літаратуры і беларускай мовы, а адпаведна гэтаму і нагрузка на кожнага выкладчыка ад 900 да 1000 і больш, плюс сюды ж чытанне беларускай літаратуры на ФДП, на 8-мі месячных курсах, у ІУН, у гімназіі (СШ № 30), школах.

Больш таго, ужо дзве кафедры «цісну́цца» ў невялікім пакойчыку на 4 паверсе. Вырашэнне гэтага пытання бачыцца ў наступным: падшукаць памяшканне для кафедры беларускай культуры і выкананні (тэрмін абавязвае) 38 пункта Праграмы (У сувязі з тым, што беларуская мова і літаратура выкладаюцца на ўсіх факультэтах універсітэта, на ўсіх падрыхтоўчых аддзяленнях, а таксама прымаюцца ўступныя экзамены па беларускай мове і літаратуры, павялічыць штатны расклад кожнай кафедры на 4 адзінкі (верасень 1990 г.). А пакуль што гэта толькі на паперы. І паверце, каб своечасова, аператыўна і якасна рэагаваць на вучэбны працэс, патрэбен прыліў новых творчых сіл, увасабленне ў жыццё п. 38.

Варта толькі вітаць крок універсітэта аб адкрыцці на філалагічным факультэце чыста беларускага аддзялення, больш таго, у складзе трох груп. Добра, што на гэтым аддзяленні большасць дысцыплін чытаецца на беларускай мове. Аднак і тут ёсць свая «ахілесава пята», якая ў адмоўным плане высвечвае п. 7 Праграмы. (Перавесці на беларускую мову выкладанне ўсіх дысцыплін на беларускім аддзяленні філалагічнага факультэта і факультэце методыкі пачатковага навучання. 1990—1991 гг.).

Пры універсітэце арганізаваны курсы для выкладчыкаў па вывучэнню беларускай мовы, (на гэта ёсць адпаведны загад рэктара) але іх наведвае толькі невялікая колькасць (5-7 чалавек). У такім разе, усе астатнія валодаюць беларускай мовай, распрацавалі методыкі навучання сваіх прадметаў на беларускай мове (на практыцы пакуль што нябачна), або свядома ігнаруюць п. 13 Праграмы, у якім запісана «Усім выкладчыкам універсітэта вывучыць беларускую мову, як мову выкладання (1990—1993 гг.). Уменне весці заняткі на беларускай мове ўлічваць пры атэстацыі як важны фактар прафесіяналізму».

Хацелася б яшчэ звярнуць вашу ўвагу на п. 10 Праграмы, які гучыць («перавесці на беларускую мову візуальную інфармацыю ва універсітэце». Тэрмін 1990—1991 гг.

А што мы бачым на яве. На першым паверсе амаль усе аб´явы, расклады заняткаў, напісаны на рускай мове. За гэты прамежак часу па пальцах можна пералічыць, хто за дапамогай звяртаўся на кафедру беларускай літаратуры, мовы, культуры. Нядаўні прыклад. Аб´ява падпісвацца на «Гродзенскі універсітэт» на рускай мове. Пра якую логіку можна гаварыць. Што датычыцца назваў кафедр, іншых структур і падраздзяленняў універсітэта, то даўно іх ужо можна было б чытаць на беларускай мове, запазычыўшы вопыт БДУ (прыгожа напісаныя назвы на паперы пад шклом).

І зусім нядорага і проста.

З прыведзеных фактаў бачна, што нешта намі зроблена, але яшчэ больш патрэбна зрабіць і не толькі сіламі трох кафедр, а і сур´ёзнай, якаснай творчай працай усяго калектыву універсітэта, каб па-сапраўднаму ўдыхнуць жыццё ў Праграму «Беларуская мова і культура».

**П. І. МАЛЯЎКА,**
**дацэнт, старшыня Таварыства беларускай мовы пры ГрДзУ.**

# ПАСТАНОВА
## Вучонага савета ГрДзУ імя Я. Купалы па пытанню «Аб ходзе выканання калектывам універсітэта доўгатэрміновай праграмы «Родная мова і культура»

Разгледзеўшы і абмеркаваўшы пытанне «Аб ходзе выканання калектывам універсітэта доўгатэрміновай праграмы «Родная мова і культура», Вучоны савет Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы адзначае, што за прайшоўшыя са дня зацвярджэння Праграмы дзесяць месяцаў (27 лютага 1990 года) зроблены адпаведныя крокі ў напрамку яе здзяйснення. Так, на ўсіх факультэтах уведзены ў вучэбны план і чытаецца курс «Гісторыя беларускай культуры», на гістарычным, філалагічным факультэтах і на факультэце педагогікі і методыкі пачатковага навучання чытаецца курс «Гісторыя БССР», выдаецца на беларускай мове шматтыражная газета «Гродзенскі універсітэт», створаны курсы па вывучэнню беларускай мовы выкладчыкамі універсітэта, створана кафедра беларускай культуры, кафедрамі вядзецца значная работа па аказанню дапамогі грамадскім службам і ўстановам горада ў пераходзе да беларускай мовы як дзяржаўнай.

Зробленае, аднак, не можа задаволіць калектыў універсітэта, таму што па-за ўвагай факультэтаў і кафедр засталіся пытанні, ад тэмпу і якасці вырашэння якіх залежыць лёс праграмы «Родная мова і культура». Ва універсітэце на сённяшні дзень не склалася сітуацыя глыбокай зацікаўленасці ў адраджэнні роднай мовы, у развіцці нацыянальнай культуры. Толькі на філалагічным факультэце і часткова на факультэце педагогікі і методыкі пачатковага навучання візуальная інфармацыя перадзена на беларускую мову. Не набрала тэмпы падрыхтоўка і дрэнна вядзецца выданне метадычных дапаможнікаў і тэрміналагічных слоўнікаў, не вырашана пытанне аб выданні штогадовага беларускамоўнага зборніка на філалагічным факультэце і г. д.

**У сувязі з гэтым Вучоны савет універсітэта**

**ПАСТАНАЎЛЯЕ:**

1. Для паспяховай рэалізацыі праграмы па адраджэнні беларускай нацыянальнай культуры і мовы патрэбен пэўны каардынацыйны цэнтр. Таму лічыць неабходным адкрыць у 1991—92 навучальным годзе факультэт беларускай філалогіі і культуры са спецыяльнасцю «выкладчык беларускай мовы, літаратуры і культуры». У складзе факультэта мэтазгодна мець пяць спецыяльных кафедраў: 1) беларускае мовазнаўства (кафедра абслугоўвае спецыяльнасць «беларуская мова, літаратура і культура»); 2) беларуская мова (для неспецыяльных факультэтаў, у тым ліку факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання); 3) кафедра беларускай літаратуры; 4) кафедра беларускай культуры; 5) кафедра гісторыі і этнаграфіі Беларусі.

2. Дэканам факультэтаў, загадчыкам кафедр, кіраўнікам падраздзяленняў універсітэта звярнуць асаблівую ўвагу на неабходнасць сур´ёзнага выканання Праграмы «Родная мова і культура». Кантроль за ходам выканання Праграмы ўскласці на прарэктара па вучэбнай частцы Габрусевіча С. А.

3. Рэктарату універсітэта разгледзець пытанне аб адкрыцці з 1 верасня 1991 г. на беларускім аддзяленні філфака спецыялізацыі «Беларуская і сусветная культура» і зрабіць кафедру беларускай культуры выпускаючай.

4. У адпаведнасці з «Праграмай Міністэрства народнай адукацыі БССР па рэалізацыі Закона «Аб мовах у Беларускай ССР» гл. «Беларуская мова і літаратура ў школе», 1990 № 10, с. 3—12) павялічыць з 1991—1992 навучальнага года колькасць гадзін на вывучэнне беларускай мовы, літаратуры і культуры на нефілалагічных факультэтах і педаддзяленнях універсітэта да 300, увесці курсы беларускай мовы, літаратуры, культуры, гісторыі Беларусі ў навучальныя планы ўсіх факультэтаў, выдзеліўшы для гэтага неабходную колькасць штатных адзінак.

5. На ўсіх факультэтах універсітэта абнавіць чытанне курсаў беларускай мовы, літаратуры, надаць гэтым курсам прыкладны характар, культурна-асветніцкі напрамак. Даручыць кафедры беларускай культуры распрацаваць праграму курса да 1 красавіка 1991 г.

6. Практычны курс беларускай мовы, а таксама курсы беларускай літаратуры і беларускай культуры ўключыць у навучальныя планы факультэтаў давузаўскай падрыхтоўкі і падрыхтоўчых аддзяленняў універсітэта.

7. Увесці з 1991 года профільны экзамен па беларускай мове і літаратуры для паступаючых на педагагічныя спецыяльнасці ўсіх факультэтаў.

8. Даручыць кафедры беларускай культуры да 1 чэрвеня 1991 г. прааналізаваць пытанні, падрыхтоўчую праграму, каб з верасня 1991 г. пачаць выданне штогадовага альманаха «Культурная спадчына Гродзеншчыны».

9. Паскорыць перападрыхтоўку ўсіх выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта, якія не валодаюць беларускай мовай.

10. Дэканатам факультэтаў абмеркаваць пытанне пра неабходнасць і важнасць выкладання курса «Гісторыя беларускай культуры».

11. Усім кафедрам універсітэта распрацаваць свае праграмы на аснове Праграмы «Беларуская мова і культура», прынятай у лютым 1990 г. і ўнесці сур´ёзныя карэктывы ў планы работ усіх факультэтаў.

12. Камісіі дапрацаваць Праграму «Беларуская мова і культура» з улікам усіх прапаноў і пажаданняў, выказаных членамі Вучонага савета універсітэта і іншымі супрацоўнікамі ВНУ.

УПЕРШЫНЮ Ў ГОРАДЗЕ

**В Зимней и Летней церквях музея истории религии продолжается выставка Фонда независимого современного русского искусства, организованная по инициативе творческого объединения «Рунь» при Гродненском отделении БФК.**

**Работает ежедневно, с 11 до 17 часов.**

**Своими впечатлениями после посещения выставки мы попросили поделиться А. Гостева, члена правления Гродненского отделения БФК.**

# ОСОЗНАТЬ КРАСОТУ

## РАЗМЫШЛЕНИЯ НА ВЫСТАВКЕ СОВРЕМЕННОГО РУССКОГО АВАНГАРДА

На моей памяти такого еще не было. Все разом, вдруг заговорили о спасении. О спасении души, а через нее и самого человека. О спасении нации. О спасении идеалов. И, наконец, о спасении мира.

«Красота спасет мир». Давно ставшая крылатой фраза, высказанная в свое время Достоевским и получившая развитие в философии Вл. Соловьева и Бердяева, в поэзии Р. Тагора, сегодня уже мало кому вселяет надежду. Ибо катаклизмы реальности явно противоречат ей.

Но вот пробивается, набирает жизненную силу несколько иная, пронзающая своей кажущейся парадоксальностью Мысль, Мысль Н. К. и Е. И. Рерихов: «Сознание красоты спасет» («Живая этика. Община», параграф 27).

Парадокс же в том, что теперь момент активности переносится с объекта, с красоты как внешней данности, на субъект, на того, ради кого спасение. Потому что подлинная основа красоты — духовное начало. И вечный огонь духовности является той силой, что вселенский хаос претворяет в гармонию, а «разрозненные атомы объединяет в живой организм». (Р. Рудзитис). Но далеко не в каждой душе горит этот созидательный огонь. Как зажечь его? Хотя бы у тех, чья душа чуть дремлет, но не спит? Вот здесь-то на помощь приходит искусство — этот сконцентрированный источник красоты. Включается обратная связь. Идет настройка душевных сил. И истинная, внутренняя красота мироздания посредством узнаваемых образов и символов (универсальные переводчики с языка природы) заставляет душу трудиться, побуждая ее к активному, осознанному восприятию мира, всего многообразия явлений сегодняшнего дня, устремляет человека в будущее. Как в омут кидает его в пучину борьбы за завтрашний день.

Вот почему искусство всегда опережает свое время, предвосхищает достижения науки. Его задача — **с максимальной** полнотой постигнуть противоречивую, многоликую гармонию мира— извечную, непрекращающуюся борьбу Добра и Зла, и выразить ее с **максимальной** наглядностью и доходчивостью. Вот почему так многообразны и порой противоречивы формы искусства. Вот почему все не могут одинаково воспринять эти формы. Вот почему необходимо сегодня (и всегда) стремиться сохранить их для будущих поколений. Что, к сожалению, знают лишь единицы. И они-то, эти неудобные правящим кругам Единицы (которые оказались вовсе не нолями) ведут сегодня речь о спасении (для нашего народа) Фонда свободного русского искусства. Трагична его история.

С 1974 года школьный учитель физики и известный ленинградский коллекционер **Георгий Николаевич МИХАЙЛОВ** устраивал у себя на квартире выставки своего постоянно пополняющегося собрания. Основа его коллекции — картины русских авангардистов 1970-х—1980-х годов. Этим оказывалась не только помощь и поддержка самим «опальным» художникам, но и совершалось благородное дело популяризации нетрадиционного искусства, приобщение, пусть узкого круга лиц, к осознанию красоты мира.

Формально власти не могли обвинить его ни в чем. Не давали нужного эффекта и всякого рода провокации (предложения через разного рода лиц перепродать купленную картину во много раз дороже и т. п.). Но такое отношение официальных органов побудило коллекционера предпринять некоторые предохранительные меры. Так родилась идея Фонда.

Первой ласточкой стала картина А. Исачева **«Что есть истина!»** Г. Н. отказался принять ее в подарок и предложил положить ей начало Фонда Исачева и пополнять его теми картинами художника, которые ему разонравились. Этим Фондом Михайлов распоряжался вдвоем с Исачевым.

21 февраля 1979 года Михайлов был арестован, а 18 сентября 1979 года Ленинградский суд приговорил все 363 картины, находившиеся в доме Михайлова, к уничтожению, а самого владельца — к 4 годам колымских лагерей.

Сегодня мы уже можем открыто и определенно выразить свое отношение к этому средневековому варварству («Каждый век имеет свое средневековье». Э. Кроткий), а в то время это было возможно только за границей. В 1980 году художники создали Фонд спасения приговоренной коллекции. Усилиями международной общественности кассационная инстанция изменяет (но не отменяет) приговор. К этому времени 11 картин и около 5000 слайдов было уничтожено.

По возвращению Михайлова его взаимоотношения с художниками были оформлены юридически. Так появился документ, определяющий взаимоотношения между Михайловым, Исачевым, Шпадаруком и их картинами, входящими в Фонд.

18 сентября 1985 года Михайлов вновь арестован и осужден к 5 годам лагерей строгого режима. Только усилиями международной общественности, а также благодаря личному участию Шарля Эрню и Миттерана, был освобожден. После этого был создан Фонд свободного современного русского искусства, текст декларации которого сегодня представлен на стендах выставки.

Судебная коллегия по уголовным делам Верховного Суда РСФСР постановлением от 19 января 1989 года отменила приговор Красногвардейского районного суда г. Ленинграда от 18 сентября 1979 года,



АВТОПОРТРЕТ

определение судебной коллегии по уголовным делам от 17 января 1980 года и постановление Президиума Ленинградского городского суда от 5 октября 1988 года в отношении Михайлова Г. Н. и дело прекратилось за отсутствием состава преступления.

Приговоренная коллекция вывезена Михайловым в Мюнхен. В тот самый Мюнхен, где в 1937 году состоялась выставка картин известных немецких художников-экспрессионистов «Дегенеративное искусство». После выставки картины были приговорены к уничтожению, но уже в 1946 году в том же Мюнхене открылась выставка, на которой представлены картины, спасенные коллекционерами от фашистского режима. История горазда на всевозможные выверты, зигзаги.

Сегодня Фонд свободного современного русского искусства, распорядителем которого является Г. Н. Михайлов, насчитывает около 6 тысяч картин и находятся они под юрисдикцией Германии. Михайлов же считает, что принадлежать они должны своему народу и предпринимает практически безнадежные на сегодняшний день попытки к созданию галереи Фонда: в Ленинграде и в Минске (галерея А. Исачева). Сидеть же сложа руки и ждать, пока его мечты воплотятся сами собой (или же окончательно развеятся) не в характере этого сподвижника культуры.

19 городов и 46 выставок — таков результат его деятельности за два года. Сейчас одна из выставок (40 работ А. Исачева) проходит в Воронеже, одна в Мюнхене, одна, после Москвы, у нас, в Гродно. Но если до лета быстротекущего года не будет принято решение о размещении картин Фонда на родине (передаются они безвозмездно), то замечательные творения русских и белорусских художников навсегда останутся за границей. Неужели один раз уже спасенная от физического уничтожения красота, на этот раз безвозвратно погибнет для многострадального, обделенного судьбой и историей народа? Кроме этого Фонд принимает участие в реализации проекта строительства международного центра искусств в Петродворце, под Ленинградом.

...Вновь и вновь перехожу от картины к картине. Невелико их количество (90 работ 31 художника; самый представительный — Исачев: 12 живописных и 4 графических шедевра). Но невероятно огромен эмоциональный заряд, заложенный в каждой работе.

Бесконечно долго можно стоять перед творениями белорусского художника из Речицы Александра Исачева (1955-1987) **«У забытых алтарей» и «Что есть истина!»**. Кажется, все тревоги и проблемы, радости и боль сегодняшнего дня художник выразил в этих двух (пусть несколько переполненных, перенасыщенных



ИСКУШЕНИЕ

деталями; скорее всего, это изобилие умышленное) картинах. Обращение к технике гладкописи старых мастеров еще более усиливает впечатление вечности животрепещущих тем, волнующих и творца, и его зрителей. А ведь есть еще **«Распятие», «Владыка», «Изгнание из рая»** и сотни иных, потрясающих работ, которые обрели, наконец, своего зрителя. Александр Исачев — единственный из представленных художников, работы которого я видел до этого. Впервые его имя услышал в 1986 году, когда в Гродно появились цветные фотокопии его творений. И, стыдно теперь признаться, просто не поверил, что это не коллаж, а подлинные самостоятельные произведения искусства (лишнее подтверждение тому, что суждение о художнике необходимо формировать только при непосредственном восприятии оригиналов). А 13 февраля 1989 года как неслыханную удачу воспринял неожиданно представившуюся возможность посетить персональную выставку А. Исачева на проспекте Машерова в Минске. Там же я впервые увидел и услышал Г. Н. Михайлова.

Минский художник Г. Миронов — одно из последних открытий Михайлова. Геннадий приехал в Ленинград для продажи своих работ и здесь, на Невском проспекте, был мгновенно выделен и оценен, стал предметом законной гордости коллекционера. Миронов не просто покоряет. Он зачаровывает своей способностью поэтически передавать загадочность и таинственность мира, его глубинную одухотворенность...

Михаил Шемякин представлен весьма скромно: единственной картиной **«Метафизическая голова».** Но и по этому единственному произведению можно хотя бы сделать попытку приобщения к сложному, противоречивому миру этого широкоизвестного художника и общественного деятеля.

Потрясающими открытиями явились для меня имена А. Зверева (1931—1986), Люйко, неосимволиста В. Сухорукова, Ю. Жарких, Б. Митавского.

А ведь, например, завораживающие **«джазовые ритмы»** (И. Дудинский) А. Зверева стали известны миру еще в 1960 году из статьи в журнале «Лайф» «Искусство России, которого никто не видит». Только совсем недавно, в 1989 году, состоялась его посмертная выставка в Москве (свыше 200 произведений живописи и графики), организованная Советским фондом культуры (см. об этом «Наше наследие», № 5, 1989).

ПРОРОК



Динамичный, многомерный Люйко восхищает своим необычным колоритом, глубочайшим психологизмом (**«Обнаженная с собакой», «Танец»**). Три произведения этого автора, которые гродненцы могли видеть только на открытии выставки, 5 января Михайлов прямо отсюда увез с собой в Ленинград, и в ночь с 6 на 7 января на телемарафоне «Возрождение» подарил от имени Фонда Петербургу — Ленинграду.

Участник знаменитой «бульдозерной» выставки в Беляево (Москва, 1974) Юрий Жарких представлен также всего одной картиной **«Невинные».** Я воспринял ее как иллюстрацию к мортирологу «Куропаты». Картина подтверждает тезис самого художника: «Живопись раскрывает предметность как условие творческой жизни сознания. Предмет обнаруживается через историчность сознания художника». Цитата взята из великолепного каталога Ю. Жарких (издание ЛО СФК, 1989 г.), который я с удовольствием приобрел на выставке. И этот момент, так же как и возможность приобрести чудесные репродукции Исачева, Сухорукова, Бориса Митавского (именно его **«Часы с боем»**, картины, которую я воспринял как образ нашего сегодняшнего неспокойного, подверженного катаклизмам, времени)— еще одна особенность этой уникальной для гродненцев выставки.

Много споров, вплоть до резкого неприятия, вызвали остропсихологические работы Л. Седякина **«Механизмы психики» и «Рождение социализма».** Я же перед этими картинами, кажется, наконец осознал, насколько глубоко коренится в нас зло. И сегодня, пожалуй, это единственный безотказный прием в искусстве: выпячиванием уродства еще более подчеркивать ценность гармонии. Тем самым безмерно увеличивается вероятность пробуждения у зрителя сознания красоты.

Преисполненный чувства величайшей благодарности ко всем, кто сохранил и донес до нашего зрителя эти замечательные шедэвры, покидаю залы Летней и Зимней церквей...

А какие мысли вызвала у меня эта выставка, об этом я написал в самом начале заметок.

**А. ГОСТЕВ.**

**НА СНИМКАХ: репродукции картин А. Исачева.**

# Слово о поэте



* * *

О, я хочу безумно жить:
Все сущее — увековечить.
Безличное — вочеловечить,
Несбывшееся — воплотить.

Пусть дышит жизни сон тяжелый,
Пусть задыхаюсь в этом сне —
Быть может, юноша веселый
В грядущем скажет обо мне:

Простим угрюмство — разве это
Сокрытый двигатель его?
Он весь — дитя добра и света,
Он весь — свободы торжество!

Мало кто из поэтов сумел так выразить в своем творчестве себя и все то, что «так сложно, так трудно и праздно...», как это сделал А. А. Блок. Выразить век, время, в котором творил, стать пророческим поэтом своей переломной эпохи. «Открой мои книги: там сказано все, что свершится»,— говорил А. Блок. Решительно никто из поэтов его времени ни у нас, ни на Западе, не ощутил с такой остротой и не передал с такой впечатляющей художественной силой подземный шорох истории и «новый порыв мирового ветра».

Возникает интересный вопрос: как же могло случиться, что такая доля выпала поэту, который был увлечен символизмом и вырос на почве культуры старого мира? Много лет спустя, говоря о стихах знаменитого поэта, Блок косвенно охарактеризовал и важную особенность собственных стихов: «Я думаю, что предметом этого стихотворения является не только личная страсть Катулла, как принято говорить; следует сказать наоборот: личная страсть Катулла, как страсть всякого поэта, была насыщена духом эпохи..., ибо в поэтическом ощущении мира нет разрыва между личным и общим: чем более чуток поэт, тем неразрывнее ощущает он «свое» и «не свое», поэтому в эпоху бурь и тревог нежнейшие и интимнейшие стремления души поэта также приспосабливаются и преисполняются бурей и тревогой».

Именно такая эпоха наступила на рубеже XIX—XX вв. По выражению Б. Пастернака, в ту пору сама действительность была символистом, «вся скорее что-то значила, нежели составляла». Эту эпоху гениально выразил Блок. Главная черта поэта — страстное стремление отыскать всеобщую связь явлений, «нащупать внутренние сцепления». Оно проходит через все творчество Блока, начиная со стихов о Прекрасной Даме и заканчивая поэмой «Двенадцать». Перед нами встает ищущий, томящийся и печальный образ, который живет в особом мире, далеком от простых и обыкновенных радостей жизни. Ведь в стихах его редко появляется юмор, а веселости и в помине нет.

А между тем в живом, настоящем Блоке было много светлого юмора и самой непосредственной веселости. Андрей Белый, впервые увидев Блока, был потрясен той молодостью, которая исходила от поэта. В своей речи в Обществе ревнителей художественного слова 5 апреля 1910 года Блок говорил: «Художник должен быть трепетным в самой дерзости, зная, чего стоит смешение искусства с жизнью, и оставаясь в жизни простым человеком». Он этот завет исполнил. Душа его была беспокойной, всегда тревожной. Эту тревогу Блок передал в своих стихах, выполнив требования, предъявленные самому себе, пожертвовав поэзии все, чем обладал. И уже в этом одном его величие и его правота.

**Полтора столетия назад В. Г. Белинский высказал мудрую мысль о том, что истинная поэзия выше жизни, ибо поэзия — квинтэссенция жизни. Творчество Поэтов, чьи юбилеи мы недавно с благодарностью отметили, подтверждает тезис великого критика.**

**А. БЛОК и О. МАНДЕЛЬШТАМ... Разделенные рождением лишь на каких-то 10 лет, они оказались по существу поэтами разных исторических эпох. Однако, исповедуя святой для русской литературы принцип тайной свободы, сумели сказать о своем времени очень много.**

## НОВЫЕ КНИГИ О БЛОКЕ

В 1990 году в издательстве «Правда» вышла книга М. А. Бекетовой «Воспоминания об Александре Блоке», в которую вошли давно не опубликовавшиеся воспоминания, а также дневники автора. В приложении опубликованы материалы «Веселость и юмор Блока», «О рисунках Блока», «О шахматовской библиотеке». Книга ценна тем, что в ней собран новый и интересный материал, который позволяет по-новому увидеть жизнь и творчество известного поэта.

Чрезвычайно любопытна и книга К. Кедрова «Поэтический космос». Автор книги как бы перелистывает «звездную книгу» литературы. Здесь тайнопись созвездий, «звездная азбука», «космический алфавит» С. Есенина, В. Хлебникова, А. Блока, А. Белого, что позволяет автору создать теорию метакода и с новых позиций осмыслить метафору как поэтический прием. Особый интерес представляет глава «Звездный сад А. Блока», в которой автор связывает историю звезд, планет с главными героинями поэта: Незнакомкой, Прекрасной Дамой, Катькой.

Большой интерес представляет и книга М. З. Долинского «Искусство и Александр Блок», в которой биография поэта осмыслена в плане воздействия на Блока различных искусств, в частности живописи. Блок сам прекрасно рисовал, иногда иллюстрировал свои произведения. Итересна и проблема живописной интерпретации поэзии Блока, затронутая в книге.

**СОВЕТУЕМ ПОЧИТАТЬ:**


Блок А. Дневник. М., 1989.
Замятин Е. Воспоминания о Блоке.— Юность, 1988, № 5.
Белов С. Что подарила память... А. Блок в неизданной переписке и воспоминаниях современников.— Литературное обозрение, 1986, № 10.
Книпович Е. Мои встречи с Блоком. М., 1987.


# «О, тихая моя свобода...»

Осип Мандельштам возвращается к нам, но возвращается по крупицам, и лишь по фрагментам мы можем сегодня восстановить судьбу этого замечательного человека. По фрагментам воспоминаний друзей, записям в старых дневниках. Еще совсем недавно, в 1987 году, составитель сборника русской поэзии рубежа веков в биографической справке о поэте стыдливо написал: «Умер в 1938 году». Почему «умер»? отчего? от старости? И только сейчас выявляется то, что скрывалось за фигурой умолчания: не умер, а погиб в сталинском концлагере.

Трагическая жизнь всегда вызывает острое чувство сострадания и дополнительный интерес к творчеству поэта, чей путь был отмечен судьбой.

Ранняя лирика Мандельштама потрясла меня филигранностью формы и глубиной поэтического содержания. Ранний Мандельштам — это человек, философски осмысливающий свое появление и место на земле, свою связь с природой:

**Я так же беден, как природа,**
**Я так же прост, как небеса.**

Поэзия первых сборников как бы двуслойна: за внешней простотой, где все выражено предельно четко, простым, «земным» языком, стоит глубокая мысль о связи Поэта с миром, со Вселенной, с Культурой:

**Я вздрагиваю от холода,**
**Мне хочется умереть,**
**А в небе танцует золото,**
**Приказывает мне петь...**
**Так вот она настоящая,**
**С таинственным миром связь,**
**Какая тоска щемящая,**
**Какая беда стряслась.**

Такое мироощущение может быть лишь у настоящего поэта, способного «сердцем ощутить трещину мира». Но не все могут окружающий мир пропустить через стихию «обманчивого сходства с действительностью», поэтому поэтов мало, а версификаторов много. «Божественный глагол» посещает лишь того, чье сердце способно встрепенуться, откликнуться на зов истины. Таким поэтом, несомненно, был Мандельштам.

И еще одна черта, отличающая Мандельштама: он свободно обращается к мировому культурному наследию, историко-культурные реминисценции составляют неотъемлемый элемент его поэтики. Причем прошлое не является предметом, объектом эстетизации, как у Н. Гумилева или В. Брюсова; наоборот, «чужая песня», «чужих певцов блуждающие сны» всегда были для него частью собственного поэтического мира:

**И снова скальд чужую песню**
**сложит**
**И как свою, ее произнесет.**

Революцию поэт встретил сочувственно. Но зоркий взгляд истинного художника не мог не заметить в молодой республике ростков будущей системы, превратившей страну в огромный лагерь. Недаром уже в стихах 20-х годов начинают звучать тревожные мотивы:

**В Европе холодно. В Италии**
**темно.**
**Власть отвратительна, как**
**руки брадобрея.**

Особенно волновала поэтому Мандельштама проблема свободы художника. И хотя петля захлёстывалась вокруг него все туже, он писал:

**И не ограблен я,**
**и не надломлен,**
**Но только что всего**
**переогромлен...**
**Как Слово о Полку струна моя**
**туга,**
**И в голосе моём после**
**удушья**
**Звучит земля — последнее**
**оружье —**
**Сухая влажность**
**черноземных га!**



Сусальным золотом горят
В лесах рождественские елки,
В кустах игрушечные волки
Глазами страшными горят.

О, вещая моя печаль,
О, тихая моя свобода,
И неживого небосвода
Всегда смеющаяся даль

* * *

За гремучую доблесть грядущих
веков,
За высокое племя людей
Я лишился и чаши на пире отцов,
И веселья, и чести своей.

Мне на плечи кидается
век-волкодав,
Но не волк я по крови своей,
Запихай меня лучше, как шапку
в рукав
Жаркой шубы сибирских степей.
Чтоб не видеть ни труса,
ни хлипкой грязцы,
Ни кровавых костей в колесе,
Чтоб сияли всю ночь голубые
песцы
Мне в своей первобытной красе,

Уведи меня в ночь, где течет
Енисей
И сосна до звезды достает,
Потому что не волк я по крови
своей
И меня только равный убьет.

* * *

Дано мне тело — что мне делать
с ним,
Таким единым и таким моим?
За радость тихую дышать и жить
Кого, скажите, мне благодарить?
Я и садовник, я же и цветок,
В темнице мира я не одинок.
На стекла вечности уже легло
Мое дыхание, мое тепло.
Запечатлеется на нем узор,
Неузнаваемый с недавних пор.
Пускай мгновения стекает муть,
Узора милого не зачеркнуть.

## О ЖИЗНИ И ТВОРЧЕСТВЕ О. МАНДЕЛЬШТАМА

К юбилею О. Э. Мандельштама в издательстве Воронежского университета вышла книга «Жизнь и творчество О. Э. Мандельштама». Книга представляет собой великолепно проделанную работу группы ученых Воронежского университета, собравших по крупицам и объединивших в один сборник разнообразный материал, прекрасно характеризующий Мандельштама как человека, как поэта. «Поэзия Мандельштама — наша опора, наша надежда в сопротивлении омертвлению,— пишет А. Кушнер во вступительной статье,— Тяжесть времени, выпавшая на долю рожденного «в ночь с второго на третье января в девяносто одном ненадежном году», несравнима с нашей,— тем непростительней для нас было бы не расслышать то, что он шептал «обескровленным ртом».

В книге в первую очередь интересны неизвестные ранее воспоминания А. Б. Гатова, О. К. Кретовой, Я. Я. Рогинского. В приложении напечатана автобиография Н. Е. Штемпель (1908—1988), которая прожила в Воронеже всю жизнь и знала поэта в годы воронежской ссылки.

Особый интерес вызывает раздел «Новые стихи», подготовленный И. М. Семенко, где впервые публикуются неизвестные прежде, написанные в Воронеже стихи. Например, такое:

Еще он помнит башмаков
износ —
Моих подметок стертое
величье,
А я — его: как он разноголос,
Черноволос, с Давид-горой
гранича.

Подновлены мелком или
белком
Фисташковые улицы-пролазы:
Балкон-наклон-подкова-конь-
балкон,
Дубки, чинары, медленные
вязы...

И букв кудрявых женственная
цепь
Хмельна для глаза в оболочке
света, —
А город так горазд и так
уходит в крепь
И в моложавое, стареющее
лето.

В книге представлены и исследования известных советских литературоведов В. С. Баевского, М. Л. Гаспарова, А. Л. Илюшина, М. Б. Мейлаха, И. М. Семенко.

**СОВЕТУЕМ ПОЧИТАТЬ:**


Бродский И. Сын цивилизации.— Звезда, 1989, № 8.
Мандельштам Н. Я. Воспоминания. Подъем, 1989, № 5-6. Юность, 1988, № 8.
Осип Мандельштам. Последние творческие годы.— Новый мир, 1987, № 10.



**Материалы страницы подготовлены студентами филфака: И,Янч (об А. Блоке), М. Лыковой І. Хох (об О. Мандельштаме).**



Наш адрас:
230023, г. Гродна,
вул. Ажэшка, 22, пакой 404,
тэл. 44-72-97

Газета выходзіць штотыднёва

Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня вул. Паліграфістаў, 4.

Зак. 446
2000 экз.

Рэдактар
Л. С. ЗАСЕЛЬСКАЯ.